І.Ч. Часнок (Мінск, БДУ)

# ЭКСПРЭСІЯНІСЦКІ ДЫСКУРС У СКАРБАХ ЖЫЦЦЯ М. ГАРЭЦКАГА

«Скарбы жыцця» — развітальны твор Максіма Гарэцкага. Мяркуецца, што празаік пісаў яго ў 1932–1935, 1937 гг.

Выключнасць арыгінальнай мастацкай структуры «Скарбаў жыцця» адзначалі А. Адамовіч, М. Мушынскі [1; 5]. Пра пашыраны эмацыянальны дыяпазон і актыўную змену апавядальных ракурсаў у разглядаемым творы пісала Л. Сінькова [4].

Даследчыкі неаднаразова звярталіся да аналізу «Скарбаў жыцця», але звычайна літаратуразнаўцаў цікавіла найперш вытлумачэнне алегорый і сімвалаў, суадносіны зместу з сучаснай пісьменніку рэальнасцю, філасофская абагуленасць у творы і жанравая прыналежнасць тэксту.

Вызначэнне жанравай прыналежнасці ў дадзеным выпадку выклікае шэраг складанасцей, бо сутыкаемся з сінтэзам некалькіх жанраў. Падобная сітуацыя і з пытаннем вызначэння стылістыкі ў творы, да чаго звернемся больш падрабязна.

У «Скарбах жыцця» назіраем сінтэз рэалістычнага і экспрэсіўнага дыскурсаў (пад дыскурсам будзем разумець пэўную камунікатыўную падзею, якая фіксуецца ў пісьмовым тэксце і вусным маўленні і ажыццяўляецца ў пэўнай кагнітыўнай і тыпалагічна абумоўленай камунікатыўнай прасторы, а таксама сукупнасць тэматычна суаднесеных тэкстаў). Як слушна адзначыў аўтар першай манаграфіі пра М. Гарэцкага (калі не лічыць «Спробу манаграфіі» Ант. Адамовіча) Д. Бугаёў, «Скарбы жыцця» «кожным сваім радком крычаць, пратэстуюць супраць паняволення чалавека, здзеку» [2, с. 229].

У тэксце знаходзім характэрную для экспрэсіянізму адчужанасць героя. Нягледзячы на наяўнасць разваг пра краіну і лёс народа, у абсалютным цэнтры ўвагі знаходзяцца пачуцці героя-апаведача, які адчувае сваю бездапаможнасць, немагчымасць змяніць што-небудзь, фатальнасць. Ён вымушаны прыняць свой лёс, хоць у яго голасе часта гучыць адчай: «*Стапталіся мае лапці, урэзаліся аборы ў ногі, давяць матузы ад хатыля. Ідуць — іду. Узіраюся ў вечнасць*» [3, с. 526], «*І драмотныя, сціха-клапатлівыя галасы іхнія, спрадвечных жаласных пустэльнікаў, у бязмернай, засыпанай снегам, сцюдзёнай, цёмнай, безбярэжнай і мутнай пустэльні.*

*Чую хрып, скрып. Капашэнне ў вечнасці. А гэта — адзін этап. І ўсё!*» [3, с. 526]; «*Ціхамірныя васілёчкі сінелі мне бедным хараством. Вось тут моц мая красавала. Як жа я такою моцаю свет заваюю?*» [3, с. 529]; «*І нікому мае хітрыкі мужствам не здаліся. І быў я толькі дурань, разжалены самім сабою*» [3, с. 537]; *«Я, буйвал стары, бязрогі...»* [3, с. 547]; *«За што яны гнятуць мяне, за што яны мучаюць мяне? Нашто гэта патрэбна?»* [3, с. 548], *«Няўжо ж я панам хацеў быць? Нашто ж я памылак гэтых нарабіў? У труну ўсіх загнаў, паклаў. І сам лёг...»* [3, с. 548].

«Скарбы жыцця» М. Гарэцкага вылучаюцца частотнай лейтматыўнасцю, паўтаральнасцю і пашыранай эквівалентнасцю элементаў тэксту (паводле В. Шміда, г. зн. паўтаральнасцю таго, што прадугледжвае адначасова як падабенства, так і апазіцыю [7]). Трагічнае светаадчуванне героя-апаведача, яго пакуты перадаюцца праз адмысловы сінтаксіс, узмацняе сугестыўны эфект у «Скарбах жыцця» сінтаксічны паралелізм: «*Светач жыцця майго гарэў цьмяна. Ваканіцы волі мае былі зачынены глуха. Томна было мне жыць.*

*Павялыя васілёчкі, што яна любіла, што яна збірала, — рукі нячыстыя чапалі. Ныла мне вечная рана…*

*Пасохлую ніву маю таптталі, дратавалі, з гора майго кпілі»* [3, с. 529]; «*Сівыя хмары плылі на мяне. Дажджы ліліся на лысую галаву маю. Вецер сцюдзёны веяў на мяне, вецце на дрэвах грозна шумела мне»* [3, с. 539]; «*Цёмен стаў мой свет. Цесен стаў мой кут. Канец мне прыйшоў…»* [3, с. 547]. Аказвае незвычайнае ўражанне на чытача і гукапіс (напрыклад, «Вы*р*ыла косці — шэ*р*ыя, ст*р*упехлыя, зямля на іх наліпла; *р*охкнула і пайшла *р*ыць яшчэ дзе»), рытмізаванасць празаічнага тэксту.

Выкарыстанне паэтычных структур у дадзеным творы сведчыць пра эмацыйнасць і пачуццёвасць, якая (звычайна, у родава-жанравай норме) прэвалюе ў лірыцы, а не ў эпасе. З ростам колькасці эквівалентнасцей, паўтораў, з кожнай матэрыялізацыяй лейтматыву ў мастацкім слове ўзрастае экспрэсіўнасць у творы. Варта адзначыць, што пашыраная эквівалентнасць выкарыстоўваецца для эмацыянальнага ўздзеяння ў народных плачах, галашэннях (трэнасах), якія часта характарызуюцца спантаннасцю і наяўнасцю ў іх ладу нейкага спрадвечнага паэтычнага мыслення і досведу.

Твор не проста надзвычай эмацыйны, яму ўласціва так званая «крыкавасць». У пэўныя моманты перадаецца стан жаху і трагічнай экзальтаванасці, стан пратэсту супраць жорсткай і абсурднай рэчаіснасці. Часам гэта перадаецца праз лямант: «*Братка ты мой, братка»* [3, с. 525], «*О мой край! О мой шлях!»* (гучыць рэфрэнам), *«Скарбы мае, скарбы бясцэнныя! Што з вамі робяць! Як жа мне жыць…»* [3, с. 529], «*О, гора мне, гора мне*!» [3, с. 532], *«Сцюжна мне, дымна мне жыць!»* [3, с. 533]; «*Божа мой! Якая часам была мне нуда… Як цяжка было мне, як цяжка…»* [3, с. 548], «*Божа мой, госпадзі, як было мне цяжка*!» [3, с. 549].

Тэма смерці адна з ключавых у «Скарбах жыцця». Знаходзячыся ў экзальтаваным стане, апавядач пачынае апісваць нябожчыка, а пасля становіцца зразумелым, што гэта сябе ён уяўляе мёртвым: *«Бачу я поўную хату людзей. А ў ёй — новая, белая труна: фуганкам выструганыя шалёвачкі.*

*Бачу я жоўтае, вечнае, невядомае. Венчык на чале. Сашчэпленыя, вымытыя да сіняга, працоўныя рукі.*

*Гэта ж ты сам!*

*Не бойся, не адхіляйся, прыпадзіпытлівымзрокамколькіхочаш, падумай. Паглядзі на сябе, богэта ж ты сам…»* [3, с. 527–528].

Не толькі свядомасць героя выяўлена ў тэксце, але і яго несвядомае, калі быццам трызненні-жахі паўстаюць перад чытачом. У думках героя-

апаведача ўзнікаюць амаль містычныя вобразы: «*Рудая, лычкастая свіння, з доўгім, голым, маршчынаватым хвастом, са шчэццю стаяком на хрыбціне, рохкае, рыецца ў сваёй вечнасці… Вырыла косці — шэрыя, струпехлыя, зямля на іх наліпла; рохкнула і пайшла рыць яшчэ дзе*» [3, с. 526], «*І вось прыгледзіўся я — і скура сшорхла ў мяне ад жаху…*

*Жоўтыя, мёртвыя твары… Мерклыя, згаслыя вочы… Ходзяць –трупы жывыя… І зацягнулі па-вясельнаму жудасную мёртвую песню:*

*— Зя-лё-ны вя-но-чак!..»* [3, с. 531]

Пры тым, што ў «Скарбах жыцця» ёсць і храналагічнасць, і алегорыі, якія выкарыстаны з мэтай зашыфраваць вядомыя з’явы рэчаіснасці, канкрэтных людзей, аднак у пэўныя моманты відавочная дэфармацыя рэальнасці — характэрная асаблівасць экспрэсіянізму. Напрыклад, у гэтым урыўку размова ідзе хутчэй за ўсё пра камуністычную ідэю: *«Там яна маною д’ябальскаю спакусіць мяне хацела. І схапіла мяне, палужывога-палумёртвага, і ў душу маю смяртэльным пацалункам, як вурдалак, упілася.*

*Хацела выпіць мяне да дна, каб нічога не засталося ад мяне. І так сціснула мяне корцю сваёю, што аж косці мае захрусцелі…*

*Маною д’ябальскаю атручала мяне. Я ж вялікую моц пачуў там у сабе: у бяссільнасці сваёй спрадвечнай пачуў...»* [3, с. 530]. Аднак тут мы не знаходзім наўпроставага адлюстравання рэчаіснасці. На першым плане асабістае, суб’ектыўнае. Перадаюцца перажыванні героя, выкліканыя сутыкненнем з варожым, жахлівым сусветам, якому ён не можа супрацьстаяць: *«Божа мой, Божа мой, — што я там бачыў! Ад уваходунаправа, налева, і скрозь прад вачыма, на аперацыйных сталах, апушчаных у дол так нізка, — упокат ляжаць мерцвякі… І я з імі легчы мушу…*

*Цёмна ў яме глыбокай, цёмна! Толькі ўзор павучыны кладзецца на сэрца ярмом нязносным. Роўналежныя лініі — вечнасць. Яны перасечаны тут — гэта моц, што сэрца гартуе…*

*Гэтая моц сэрцу майму не падсілу: яно разарвецца… Я адзін. Іскаркі сыплюцца з воч. У галаве так лёгка, лёгка. Зараз канец, зараз…*

*Успомні пра выспу Патмос! Там ратунак, збавенне!*» [3, с. 532]. Ізаляванасць героя і адзінота абумоўленыя рэальнымі абставінамі ў жыцці самаго пісьменніка, які ўсведамляў, што адбываецца ў тагачасным грамадстве з абвінавачанымі і разумеў, што яго жыццё таксама можа хутка скончыцца. Градус эмацыянальнасці на працягу ўсяго твора павышаны: «*Судзі мяне, судзі мяне кожны і ўсякі! Судзі мяне судом сваім, і кожным і ўсякім… Карай мяне карамі сваімі, карай…*

*Толькі прашу цябе: не выбівай з маіх худых і кволых рук гэтага маленькага пучочка васількоў...»* [3, с. 530].

Ухіл у філасофскія развагі і аўтабіяграфічнасць, дзённікавасць не перашкаджаюць дамінаванню экспрэсіяніскага дыскурсу ў «Скарбах жыцця», з дапамогай чаго вырашаецца задача зазірання кудысьці глыбей, за знешнія праявы жыцця.

Экспрэсіянісцкі дыскурс адзін з вызначальных у разгледжаным творы. Аднак ён створаны на рэалістычнай аснове, таму што дэфармацыя рэальнасці ў «Скарбах жыцця» падпарадкавана стварэнню тыповага характара ў тыповых абставінах, з адэкватным, нават празрыста-алегарычным адлюстраваннем сацыяльнай дэтэрмінаванасці ўсіх і макра-, і мікрападзей. Экспрэсіянісцкія фарбы тут — не самамэта, а неабходнасць, абумоўленая пэўнымі абставінамі і страшэннымі пакутамі М. Гарэцкага-рэаліста, які знаходзіўся ў надзвычай складаным стане.

Экспрэсіянісцкі дыскурс выяўляецца ў «Скарбах жыцця» праз эфект адчужэння героя, яго трагічнае светаадчуванне з усведамленнем непазбежнасці лёсу і варожасці свету, праз «крыкавасць», дэфармацыю рэальнасці, надзвычай яскравыя і амаль містычныя вобразы, павышаную эмацыйнасць, спецыфічны паказ несвядомага, а таксама праз выразную рытмічную арагнізацыю, эквівалентнасць.

ЛІТАРАТУРА

1. Адамовіч, А. Браму скарбаў сваіх адчыняю… — Мінск, 1980.
2. Бугаёў, Дз. Максім Гарэцкі.. — Мінск, 2003.
3. Гарэцкі, М. Скарбы жыцця // Выбраныя творы. — Мінск, 2009. — С. 524–550.
4. Корань, Л. Максім Гарэцкі // Цукровы пеўнік: літ.-крытыч. арт. — Мінск, 1996. — С. 22–65.
5. Мушынскі, М. Падзвіжнік з малой Багацькаўкі: жыццёвы і творчы шлях Максіма Гарэцкага // навук. Рэд. А.М. Макарэвіч. — Мінск, 2013.
6. Чернявская В.Е. Лингвистика текста. Лингвистика дискурса // В.Е. Чернявская. — М., 2012.
7. Шмид, В. Нарратология. — М., 2003.